# Заказнік у горадзе

**Я вырас на правым беразе ракі Дубравенкі, якая працякае праз Пячэрскі лесапарк. Маляўнічыя віды на верхаліны дрэў адкрываліся перад вачыма ўсё дзяцінства з акна бацькоўскага дома.**

**Процьма часу, праведзенага за адпачынкам у лесе і на Пячэрскім возеры, прывяла да паважлівага стаўлення да гэтай мясціны. Тым болын, найстарэйшыя жыхары нашага раёна часта нагадвалі нам, падлеткам, пра шматсотгадовую гісторыю прадмесця Пячэрск, лес, рэчку і яе даўнюю назву. Ад гэтага малая радзіма станавілася яшчэ болын таямнічай і прыцягальнай.**

**А між тым Пячэрскі лесапарк з'яўляецца заказнікам мясцовага значэння. Аб прычынах яго ўтварэння і сучасным стане распавёў начальнік Магілёўскай гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Пётр ЛАПО.**

**Пячэрскі лесапарк (488 га) месціцца на паўночным захадзе Магілёва ў даліне ракі Дубравенкі (прыток Дняпра), дзе штучна сгварылі Пячэрскае возера.**

**Каб захаваць каштоўныя прыродныя комплексы і ўнікальныя аб'екты расліннага свету Пячэрскага лесапарку, прадстаўленыя насаджэннямі з дрэвастоямі цвердалістых і іглічных парод (з сярэднім узростам звыш 100 гадоў) ва ўмовах урбанізаванага асяроддзя, рашэннем Магілёўскага гар- выканкама ад 2 верасня 2021 года № 8-43 лес быў абвешчаны заказнікам мясцовай значнасці «Пячэрскі». Плошча заказніка, паводле рашэння, склала 256,3 га.**

- **Магілёўскі гарвыканкам абвясціў Пячэрскі лесапарк заказнікам мясцовай значнасці ў 2021 годзе. Што паслужыла прычынай для яго пераўтварэння?**

- У Магілёве развітая інфраструктура і высокая канцэнтрацыя прамысловых прадпрыемстваў (іх тут 71!). Гэта і машынабудаванне, і лёгкая, і хімічная, і харчовая прамысловасць. У Ленінскім раёне дамінуючай галіной з'яўляецца машынабудаванне і металаапрацоўка, якая найперш прадстаўлена Магілёўліфтмашам і Магілёўскім металургічным заводам. Магілёўскі камбінат сілікатных вырабаў і Завод палімерных труб з'яўля- юцца аднымі з найбуйнейшых вытворцаў будаўнічых матэрыялаў ва Усходняй Еўропе.

Асаблівы статус Пячэрскага лесапарку дае магчымасць захаваць яго натуральны стан як найбуйнейшага і найстарэйшага рэкрэацыйнага аб'екта (як гарадская зона адпачынку ён выкарыстоўваецца з 1919 года), у якім маюць патрэбу жыхары абласнога цэнтра з развітой прамысловацю, а таксама дазваляе мінімізаваць негатыўнае ўздзеянне ад гаспадарчай дзейнасці, што рэалізуецца на тэрыторыях, якія пры- мыкаюць да яго.

- **Якія рэдкія віды жывёл і раслін тут сустракаюцца?**

- У складзе лясных насаджэнняў 200 дрэў хвоі, дуба і елкі ўзростам 130-150 гадоў. Т аксама тут расце від грыбоў, уключаны ў Чырвоную кнігу Беларусі, - ружовая губа *(Fomitopsis rosea).* Апрача таго, гэта асяроддзе пражывання відаў жывёл, якія ахоўваюцца міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь. Да такіх відаў належаць вераб'інападобныя птушкі (шэрая валасяніца, гарадская (варанок) і вясковая (касатка) ластаўкі, лясны свірстун, шнак) і прадстаўнікі сямейства вечарнікавых: рыжая вячэрніца, позні кажан, лясны нетапыр і вушан.

- **У чэрвені 2023 года рашэннем Магілёўскага гарвыканкама былі зменены межы і плошча заказніка, якая паменшылася на 4,37 га. Што прывяло да скарачэння?**

- Пераўтварэнне выклікала пашырэннетэрыторыі Магілёўскай дзіцячай абласной бальніцы. На жаль, аналіз праектных рашэнняў устанавіў немагчымасць ажыццявіць будаўніцтва на альтэрнатыўных участках. Са складу

заказніка былі выведзены: 2,4 га пад новы лячэбны корпус з камунікацыямі, а таксама каля 2 га для рэкрэацыйнага ўладкавання і ўтварэння паркавай зоны паблізу медыцынскіх установ.

У чэрвені 2023 года дзялянку, якую планавалі вывесці са складу заказніка, абследавалі спецыялісты Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча і Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусь Па заклю чэнні навукоўцаў, выключэнне гэтай дзялянкі са складу заказніка не акажа істотнага ўплыву на экасістэмы з-за празмернай антрапагеннай нагрузкі на лясныя насаджэнні. Таксама на даследаванай дзялянцы не выявілі «чырвонакніжных» відаў жывёл і раслін, тыіювых і рэдкіх біятопаў і краявідаў. Наадварот, у яе межах адзначаецца багатая экспансія інвазійных і пустазельна-рудэральных відаў раслін - непасрэдны ўплыў урбанізаванай тэрыторыі.

- **Наколькі істотна новы статус лесапарку змяніў правы землекарыстальнікаў?**

- Да абвяшчэння заказпіка лясны масіў адносіўся да катэгорыі рэкрэацыйна-аздараўлепчых лясоў, пасля - да прыродаахоўных лясоў. Яшчэ да змянення статусу накладаліся абмежаванні на правядзенне высечак і нарыхтоўку драўніны, жывіцы і другарадных лясны х рэсурсаў.

Цяпер у заказніку забаронена ўзворванне зямель у прыбярэжных палосах, рух і стаянка машын па-за дарогамі агульнага карыстання і абсталяванымі месцамі, выкарыстаннс водных транспартных сродкаў з рухавікамі ўну гранага згарання звыш 15 конскіх сіл і інів. Нельга рабіць турысцкія стаянкі, самавольна размяшчаць палаткі і разводзіць вогнішча, будаваць склады, станцыі тэхнічнага абслугоўвання і аўтамыйкі, аб'екты выкарыстання адходаў і жылой забудовы. Таксама забараняецца выпальванне сухой расліннасці і травы на пні, выкананне работ на гідратэхнічнай меліярацыі, скід сцёкавых вод у навакольнае асяроддзе. Урэшце, непрымальнымі з'яўляюцца высечка і пашкоджанне такіх дрэў, як чарэшчаты дуб, бук, вастралісты клён, вяз, ясень, ліпа, дугласія, кедр і карэльская бяроза і г. д.

- **Ці можна задзейнічаць Пячэрскі лесапарк для экалагічнага турызму?**

- Ён больш за 100 год выкарыстоўваецца ў якасці месца масавага адпачынку гараджан. На тэрыторыі ахоўнай зоны лесапарку пабудаваны спартыўны трамплін, у раёне іглічных насаджэнняў абсталяваны зона рэлаксацыі і сцежка здароўя. Працуе пункт пра- кату, дзе можна ўзяць лодкі, катамараны, веласіпеды, ролікі і іншы спартыўны інвентар.

Можна арандаваць для пікніка альтанкі з мангалам! для шашлыка і хатку для адпачынку з сябрамі і блізкімі. Альтанкі, дарэчы, размешчаны на тэрыторыі спартыўнай школы «Спартак», дзе можна зладзіць гульні з мячом ці ў бадмінтон.

**На тэрыторыі «Пячэрскага» знаходзіцца парк актыўнага адпачынку «Рубікон», які прапануе масу магчымасцяў для актыўнага і вясёлага баўлення часу: пейнтбол, страйкбол, лазертаг і нават базукабол. Працуюць цір, батут, скаладром, тралей і вяровачны джунглі-парк.**

Пляжная зона Пячэрскага возера абсталявана драўляным насцілам, навесамі для адпачынку і кантэйнерамі для смецця. Невялікая частка парку занята асфал ьтаванай гіляцоўкай і эстрадай, дзе праводзяцца арганізаваныя святы.

**Уладзімір РУСАКОВІЧ**